# ВОДГУКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ

**Пляцоўка для дыскусій па моўных праблемах, дзякуй Богу, шырыцца апошнім часам. Вось і ў Грамадска-кансультацыйным савеце пры Адміністрацыі Прэзідэнта вострае для Беларусі пытанне, варта спадзявацца, стане прадметам абмеркавання. Хоць бы таму, што ў дарадчую структуру запрошаны <u>Алег ТРУСАЎ, старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт</u>. І хочацца, каб яго голас прагучаў ужо сёння, у Міжнародны дзень роднай мовы.**

## Беларускасць у рускамоўным савеце



«Я лічу, што Грамадска-кансультацыйны савет патрэбны — у многіх даўно не было магчымасці кантактаваць з уладамі з вока на вока. У адрозненне ад іншых сяброў гэтага савета ТБМ заўжды з уладамі кантакт мела. Таму нас і запрасілі самымі першымі, мы проста гэтым не хваліцися! І мы шмат чаго ад улад атрымліваем карыснага. У прынцыпе гэта яшчэ адна магчымасць агучыць нашы прапановы», — даводзіць старшыня таварыства. «На жаль, усе дэмакраты, прадстаўленыя ў савеце, на першым пасяджэнні размаўлялі па-руску... Таму пераканане «калі гаворыць па-беларуску — абавязкова апазіцыянер» — гэта хлусня, прыдуманая яшчэ ў XVI—XVII стст... Толькі спадар Макей паказаў, што можа вольна весці размову па-беларуску, аднак пабачыўшы, што ніхто, акрамя мяне не гаворыць, зноў вярнуўся на агульнапрынятую мову... Ці трэба казаць, што і дакументы новага дарадчага органа, таксама вядуцца па-руску?» На ўсё гэта не мог не звярнуць увагі апякун беларускасці.

«Маю прапанову — абмеркаваць стан беларускай мовы як дзяржаўнай — падтрымаў спадар Макей, ну і ўсе з гэтым моўчкі пагадзіліся. Я думаю, што калі савет будзе існаваць, мы на працягу года абмяркуем гэту сітуацыю. Тым больш што ёсць грунтоўныя падставы — улада змяніла правапіс, новы закон устае ў сілу ў наступным годзе. Да таго ж, я маю афіцыйны адказ ад усіх дзяржаўных структур, што ў 2010 годзе ў закон аб мовах будуць унесены змены. Праўда, нам абяцаюць унесці папраўкі яшчэ з 2000 года, таму я не надта і веру абяцанням. Думаю, увосень мы пачнём збор подпісаў у падтрымку гэтых жа абяцанняў уладаў. Збяром 20 — 50 тыс. подпісаў — ім няма куды будзе падзецца, мы падтрымліваем іх жа ініцыятыву. Самая галоўная папраўка, якую абавязкова трэба ўнесці, — выкінуць «ці» і «або», якія дазваляюць зусім не карыстацца беларускай мовай. Дарэчы, яны таксама дазваляюць зусім не карыстацца рускай мовай, што я і раблю. А вось мая прапанова звярнуцца да праблем школьнай адукацыі з трэскам правалілася...»

## Шчыгрынавая беларускасць?

Самая крытычная сітуацыя, на думку старшыні ТБМ, сёння ў школьным навучанні: «Колькасць беларускамоўных вучняў змяншаецца як шчыгрынавая скура, асабліва ў гарадах (там іх менш двух адсоткаў). Напрыклад, у Магілёве і Гродна няма ніводнага класа... Масава закрываюцца і вясковыя школы (па 400 у год), бо вымірае вёска. А дзяцей дапасоўваюць у рускамоўныя школы. Таму мы і зрабілі адпаведны зварот да бацькоў, настаўнікаў — каб усе разумелі, што калі мы страцім школу, мы шмат чаго пазбавімся»... Праблема не толькі ў колькасці, але і ў якасці — упэўнены наш суразмоўца. «Мяне абураюць паводзіны многіх школьных настаўнікаў беларускай мовы. Яны прынцыпова не размаўляюць па-беларуску за межамі ўрока. Дзеці ж звяртаюць на гэта ўвагу — дарэчы, яны скардзяцца ў ТБМ на такіх настаўнікаў. Я б наогул іх звальняў з працы, гэта ж поўная дыскрэдытацыя мовы! Я лічу, што ўсе, хто выкладае мову, павінны прымаць нейкую клятву вернасці ёй. Такія людзі павінны быць узорам, тады і маладое пакаленне будзе вывучаць родную мову».

Алег Трусаў вядзе ўмоўны рэйтынг заслуг ведамстваў у справе беларускасці. На рахунку Міністэрства адукацыі — ініцыятыва перавесці выкладанне геаграфіі і гісторыі Беларусі ў рускамоўных школах на рускую мову. «Праўда, мы трохі адбілі гэту справу — зараз ужо можна і па-беларуску выкладаць, але трэба настаўніку атрымаць згоду бацькоў, дзяцей. У нас нібыта дзве роўныя мовы — дык чаму бацькі павінны пісаць заявы, каб дзіця вучылася па-беларуску, а калі вучыцца па-руску, ніякіх заяў не патрэбна... На падставе якіх нарматыўных дакументаў? Вось мая ўнучка ў гэтым годзе першы раз у першы клас збіраецца. Тэлефануе нядаўна настаўніца з суседняй школы, высвятляе, ці пойдзе туды дзяўчынка. Запішыце, кажу, што яна пойдзе ў беларускамоўны клас. Мы ж з ёй толькі па-беларуску гутарым, я ёй мульцікі на беларускай мове прыношу. Як бачыць мяне — адразу, «Дзед, давай па-беларуску». А мне ведаеце што настаўніца адказвае — шукайце іншую школу. Няўжо я не магу аддаць унучку ў суседнюю школу? Чаму я павінен яе вазіць некуды як у рэзервацыю? Пытанне гэта трэба падымаць на старонках выданняў. Нават у ВНУ сітуацыя з мовай, як ні дзіўна, лепей, чым у школах. Калі выкладчык хоча працаваць па-беларуску, рэктар яму звычайна не перашкаджае, а дзе можа, дык і ціхенька і падтрымае. Большасць студэнтаў выражае заахвочанасць».

Самы лепшы прапагандыст мовы па версіі ТБМ — Міністэрства сувязі і інфарматызацыі. «Вось яму мы выказваем велізарную падзяку, на ўсе нашы прапановы там адказваюць станоўча, выпускаюць шыкоўныя маркі, канверты — розную паштовую прадукцыю на беларускай мове. Нядаўна якраз выпусцілі канверт да юбілею горада Ліды».

«Структуры Міністэрства інфармацыі трымаюцца няблага. З іх дапамогай вярнулі каляндар «Родны край». Зараз нам паведамілі, што яны павялічваюць наклад з 7 да 12 тысяч — так што людзям варта ўжо зараз заказваць «Родны край» у кнігарнях. Трэба выпускаць і насценныя беларускамоўныя календары. Чаму б «Звяздзе» гэтым не заняцца? У вас жа ёсць цудоўныя календары — я б раіў пусціць іх у вольны продаж! (Дарэчы, у ТБМ звяздоўскі каляндар з выявай Мірскага замка — на бачным месцы. — **Аўт.**). Нядаўняя сустрэча з Аляксандрам Зімоўскім, гендырэктарам Белтэлерадыёкампаніі паказала — пакуль што ён сваё слова трымае. Нават з'явіўся анонс газеты ТБМ «Наша слова» па першым канале ўпершыню за ўсё яе існаванне. І колькасць беларускамоўных перадач пачала павялічвацца. У навінах на першым канале ўжо нярэдка трапляюцца беларускамоўныя сюжэты. Так што, няхай і невялічкія, але зрухі ёсць, гэта адчуваецца».

## Чарговая хваля адраджэння

У чыноўніцкім лагеры, паводле пераканання спадара Трусава, таксама не ўсё згублена — «зараз, дзякуй боку, ідзе ратацыя чынавенства ў лепшы бок. Старыя савецкія чыноўнікі адыходзяць на пенсію па ўзросце — на змену ім прыходзяць маладыя, а гэта дзеці беларускага адраджэння. Яны гадоў 15 — 20 таму хадзілі ў беларускамоўныя класы, ведаюць нашу гісторыю, сімволіку, вольна могуць карыстацца мовай. Я шмат езджу па Беларусі і бачу, як у раёнах усё мяняецца з прыходам новых хлопцаў. Ініцыятывы на месцах растуць, як грыбы. І мы, вядома ж, іх падтрымліваем. Тым больш што ТБМ, мабыць, адзіная арганізацыя, якая заўжды віншуе ўсіх прызначаных прэзідэнтам чыноўнікаў. У кожным віншаванні мы нагадваем, што ў нас дзве дзяржаўныя мовы, каб такі чыноўнік шырока карыстаўся беларускай мовай».

Старшыня ТБМ прызнаецца, што літаральна палову яго жыцця займае перапіска з чынавенствам: «Мы пільна адсочваем сітуацыю: калі нешта не па-беларуску — мы тут жа прэтэнзіі накіроўваем, а як толькі з'явіліся ў горадзе расцяжкі з віншаваннямі па-беларуску — адразу ж удзячнасць мэру пішам. Міхаіл Паўлаў жартуе, што толькі ТБМ — яму дзякуе, маўляў, астатнія — альбо маўчаць, альбо лаюць. Дарэчы, менавіта мэр стварыў беларускамоўную гімназію ў цэнтры Менска на базе 23 школы. Яна актыўна працуе, і нават чарга ёсць — не так проста туды дзіцятка ўладкаваць».

**«У Міжнародны дзень роднай мовы я жадаю чытачам не толькі выпісваць «Звязду», але і пісаць у газету! Яна ж моцная тады, калі яе падтрымліваюць чытачы шляхам перапіскі. Няхай больш пішуць па-беларуску пра свае праблемы, тыя ж самыя моўныя праблемы, тым чынам будзе пашырацца беларускамоўная аўра. Вельмі добрая ініцыятыва «Звязды» аб'явіць для сваіх чытачоў Год мовы, тым больш, што яна карэлюе з абвяшчэннем Года роднай зямлі. Ці ж можа быць родная зямля без роднай мовы? Таму вельмі важна, каб «Звязду» прапагандавалі ў дзяржаўных структурах».**

**Алег ТРУСАЎ.**

## Дыктоўка як народнае свята

Адна з найбольш неардынарных ініцыятыў ТБМ — агульнанацыянальная дыктоўка, ужо другая па ліку. «Першая ў мінулым годзе выклікала вялікі рэзананс, дыктоўку пісалі беларусы ва ўсім свеце: ад Вёсак — да Канады і Амерыкі. У гэтым годзе мы прапагруем традыцыю і прапануем тры даты: 21 лютага — дзень роднай мовы, тым больш, 10-я ўгодкі па лініі ЮНЕСКА; 15 сакавіка — 15 год першай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзе беларуская мова стала адзінай дзяржаўнай мовай, мы павінны гэту дату шанаваць; 25 сакавіка — 91 год абвяшчэння БНР, калі ўпершыню ў 20 стагоддзі пасправабалі беларускую мову абвясціць дзяржаўнай...».

Першымі на ініцыятыву таварыства адгукнуліся сёлета беларусы Беласточчыны — запэўніў, што дыктоўку будуць пісаць шмат у якіх раёнах на ўроках беларускай мовы. «Не сумняваюся, што падтрымаюць нас дыяспары ва ўсім свеце. А радыё «Рацыя» нават будзе агучваць тэкст дыктоўкі, каб кожны ахвотны змог яе напісаць. Тым больш, што ў гэтым годзе новы тэкст дыктоўкі: акрамя папярэдняга (на словы Францішка Багушэвіча), мы бяром і тэкст Уладзіміра Караткевіча, прысвечаны роднай мове. Хто хоча, можа і трэці варыянт узяць: самае галоўнае не столькі тэкст, колькі ўдзел».

У ТБМ спадзяюцца, што традыцыя ўмацуецца: «Мы хочам, каб агульнанацыянальная дыктоўка прыжылася і стала ўсенародным святам, якое яднае беларусаў ва ўсім свеце, і не толькі беларусаў — усіх аматараў беларускага. Напрыклад, у мінулы раз у нас пісалі дыктоўку амбасадары больш чым 10 краін свету. У гэтым годзе мы зноў іх запрасілі. Некаторыя амбасадары цудоўна валодаюць беларускай мовай, як напрыклад, амбасадар Швецыі Штэфан Эрыксан, які, дарэчы, і пераможа летась. Ведаю, што англійскі амбасадар Найджэл Гуд-Дэвіс пачаў вывучаць беларускую мову, а ў мінулы раз ён пісаў дыктоўку па-англійску — яму сінхронна перакладалі тэкст...».

## «Лепш трасянка, чым яе адсутнасць»

У будучыню старшыня ТБМ глядзіць усё ж з аптымізмам: «У цэлым зрухі ёсць. Папулярнасць і павага да мовы ў беларусаў расце з кожным годам — асабліва ў Мінску і буйных гарадах. Яшчэ гадоў пяць таму, памятаю, запоўніш рускамоўны бланк па-беларуску — колькі спрэчак, праблем... А сёння — ніякіх пытанняў. Спадзяюся, што і Дзень роднай мовы будзе адзначаны на дзяржаўным узроўні».

Алега Трусава зусім не бянтэжыць, калі людзі гавораць на трасянцы: «Лепш трасянка, чым яе адсутнасць. З трасянкі народ пяройдзе і на літаратурную мову», — упэўнены суразмоўца. А звярнуць да беларускасці школу, паводле яго меркавання, можа... універсітэт: «Калі мы перавядзём навучанне на ўніверсітэтах на беларускую мову, бацькі, якія сёння прагнуць навучання для свайго дзіця па-руску, будуць стаяць пікетамі, каб яно вучылася па-беларуску». Пры гэтым старшыня ТБМ запэўнівае, што беларусізацыя школы для яго не ідэя фікс: «Самае галоўнае — беларусізацыя сям'і». А канчатковая рассяваць усе кропкі над «і» дапамога яшчэ адзін пастулат, якім карыстаецца Алег Трусаў, — «Беларус размаўляе на мове начальства. Як толькі чынавенства загаворыць па-беларуску, народ загутарыць разам з ім».

**Ала МАЧАЛАВА.**